# У горадзе Алматы пачалі сваю работу 2-я штогадовая Канферэнцыя па кіраванні спектрам для краін СНД і Рэгіянальны семінар МСЭ «Развіццё ШПД з прымяненнем тэхналогій 4G і 5G»

У горадзе Алматы, Рэспубліка Казахстан, 17 верасня 2018 года пачалі сваю працу 2-я штогадовая Канферэнцыя па кіраванні спектрам для краін СНД і Рэгіянальны семінар Міжнароднага саюза электрасувязі «Развіццё ШПД з прымяненнем тэхналогій 4G і 5G», у працы якіх прымае ўдзел прадстаўнік Міністэрства сувязі і інфарматызацыі.

У ходзе названых мерапрыемстваў будуць разгледжаны пытанні заканадаўчага і рэгулятарнага асяроддзя, стымулюючага ўкараненне, развіццё сетак 4G/5G і інавацыйных паслуг, вынікі пераходу на лічбавае вяшчанне, канверсіі спектру, падрыхтоўкі да ВКР-19, развіцця рэгіянальных і нацыянальных дарожных карт для будучага планавання выкарыстання частот у дыяпазонах 700 Мгц, 800 Мгц і 3.4 - 3.6 Ггц, падыходы ў краінах СНД і Цэнтральнай і Усходняй Еўропы да выкарыстання 5G у высокіх дыяпазонах частот, арганізацыя працэсу ліцэнзавання для пабудовы канкурэнтнага і ўстойлівага рынку.

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/17-09-2018-3503*